БАЦЬКА ДЛЯ ДЗІЦЯЦІ З ПРАБІРКІ

ПРАГРАМА ТЭЛЕБАЧАННЯ НА ТЫДЗЕНЬ — 20 КАНАЛАЎ

Выдаецца з 9 жніўня 1917г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

3 ЖНІЎНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 147 (28763)

9-24 стар.
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ДВОРНІК, старшыня Гомельскага аблвыканкама:

«Да вывучэння і вырашэння зваротаў, якія паступаюць ад людзей, важна падыходзіць адказна, узважана, у гэтай рабоце трэба пазбягаць шаблоннасці. Неабходна глыбока ўнікнуць у праблему, паставіць сябе на месца чалавека і так знайсці рашэнне таго ці іншага пытання. Выязныя прыёмы дазваляюць акрэсліць спектр пытанняў, характэрных для таго ці іншага рэгіёна, а таксама ацаніць, як працуе мясцовая выканаўчая ўлада. Прыёмы паказваюць, што нейкіх сур'ёзных пытанняў, якія патрабуюць вялікіх грашовых улівання, няма. Адчуваецца, што мясцовая ўлада стараецца зрабіць так, каб раён развіваўся, павялічваўся жыццёвы ўзровень людзей».

КАРАТКА

- **Казахстан вывучае вопыт Беларусі па будаўніцтве АЭС.**
- Арганізатары Мінскага паўмарафона — 2018 чакаюць, што ў ім возьмуць удзел 35 тысяч аматараў бегу.



- **«Белтэлекам» падключыў 2 млн абанентаў да тэхналогіі GPON з валаконна-аптычнымі лініямі сувязі.**
- Лінейку электравеласіпедаў прадставяць беларускія вучоныя на выстаўцы ў Нацыянальнай акадэміі навук у канцы жніўня.
- **Стаўкі акцызаў на паліва ў Беларусі ў 2019 годзе прапануецца знізіць на 25 % з улікам завяршэння падатковага манеўру ў Расіі.**

ISSN 1990 - 763X

ЛЕТА З КНІЖКАЙ

— Наш бібліятэчны фонд складае дванаццаць тысяч выданняў — кніг, часопісаў, альбомаў, газет і CD-дыскаў, — кажа гаспадыня Аброўскай сельскай бібліятэкі Івацэвіцкага раёна Святлана ЦЫМБАЛІСТ. — Мы маем літаратуру на ўсе ўзросты. Малыя і пажылыя, школьнікі і студэнты — нашы чытачы.

Калі я наведаў утульнае памяшканне гэтай установы, а гэта было ў сярэдзіне летняга працоўнага дня, каля століка бібліятэкара знаходзіліся два падлеткі. Яны разглядвалі кніжкі, цікавіліся новымі паступленнямі, а бібліятэкарка падшуквала ім змястоўныя матэрыялы. Нягледзячы на тое, што хлопчыкі немясцовыя — яны прыехалі ў вёску на лета да сваіх бабуль, — Святлана Іванаўна паставілася да іх як да сваіх землякоў, раіла, звяртала іх увагу на самыя адметныя і багата ілюстраваныя выданні. Клім ТРУСЕВІЧ *(на фота на першым плане)* — жыхар Пінска, і Мікіта ГРЭЧНЫ — брастаўчанін, узрадаваліся, калі даведаліся, што ім таксама дазваляецца быць сталымі абанентамі.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

■ Вандроўкі без межаў

ЗА 100 ДОЛАРАЎ — ПА ЎСІМ СВЕЦЕ

Гісторыя беларуса, які наведаў больш за 30 краін



Ліён, Францыя. Панарама з гары Фурв'е. Фота 2011 года.

Падаецца, каб вандраваць, патрэбна шмат выдаткаў: часу, сіл, грошай. Але гэта на першы погляд. Як сцвярджае Сяргей Герасімовіч, адзінае, чаго можа не хапаць — гэта дастатковага жадання. Бо калі яно ёсць, то нават за невялікія грошы можна аб'ездзіць не адзін дзясятак краін. Напрыклад, Сяргей наведаў ужо 31. Пры гэтым ён вандруе, наколькі гэта магчыма, бюджэтна, з задавальненнем дзеліцца з астатнімі, як сэканоміць на вандроўках.

— Калі пачаў вандраваць?

— У далёкім 1993 годзе: з'ездзіў у Артэк у Крым, а таксама ў Вільнюс. І тады ўсё пачалося... У свой час я паступіў на геаграфічны факультэт і адназначна вырашыў: буду вандраваць. Факультэт абавязвае. За жыццё даводзілася пачынаць і з Беларусі, і з Расіі. І калі ад'язджаю з Мінска, то звычайна маю мала грошай і шмат часу. З Масквы — роўна наадварот.

Раней я выкладаў у ліцэі БДУ, мы шмат вандравалі па Беларусі. Аднойчы да мяне падышлі дзесяцікласнікі і папрасілі, каб я іх звазіў у Прагу. Я паабяцаў, што як ім споўніцца 18, так і здзейснім іх просьбу. Прайшло два гады — зноў да мяне прыходзяць. Яны самастойна дамовіліся і наконт жытла, і даезду.

СТАР. 4

■ Нашы дзеці

У БАСЕЙН — ДА ГОДА, НА КАНЯ — З ЧАТЫРОХ

10 дзяцей з 30 пакутуюць на атлушчэнне: як не трапіць у гэтую дзясятку?

Нядаўна вярнулася са сваім сямігадовым сынам з археалагічнага лагера, дзе мы чатыры дні пражылі ў лесе. Некаторыя знаёмыя жахаюцца, як так?! Камары, антысанітарыя, а ён такі маленькі! Што б яны, цікава, сказалі, калі б даведаліся, што першы раз мы гэта зрабілі, калі яму было два гады, а прыяцелька сплаўлялася на байдарках са сваім малым, калі дзіцяці было і таго менш. Дачка іншых маіх знаёмых за першыя чатыры гады жыцця ўвогуле павандравала з бацькамі ўжо па сямі краінах. А ёсць і такія, для каго паход у 3D-кіно кожную нядзелю — найлепшы адпачынак. Дзе, як і з якога ўзросту можна бавіць час з дзецьмі, каб не нанесці ім шкоды, я вырашыла спытаць у спецыялістаў.

Дайце дзецям проста жыць!

Да трох гадоў дзіцяці ў прынцыпе не патрэбны шматлікія сацыяльныя кантакты — каб вырасці спакойным, яму ў гэты час дастаткова забавак з бацькамі, асабліва матулінага клопату. Адзінае выключэнне — басейн, куды карысна хадзіць з самых пялюшак. Гэта садзейнічае развіццю мышцаў і шкілета. Ва ўсіх астатніх выпадках трэба зыходзіць з крытэрыяў, які накладваюць на розныя віды паслуг для адпачынку іх вытворцы, і не старацца даказаць, што дзіця, нягледзячы на неадпаведнасць абмежаванням, можа больш і яго трэба пусціць. Настойваючы на гэтым, бацькі робяць кепска двойчы. З аднаго боку, падвяргаюць здароўе свайго дзіцяці рызыцы, бо ніводнае правіла не ўзнікае з ніадкуль, а разлічваецца зыходзячы з вагі, узросту і магчымасцяў. З другога — паказваюць дзіцяці, што правілы можна парушаць, і калі патупаць ножкамі, атрымаеш жаданае.

СТАР. 4



Кіраўніцтва абласцей на сувязі

Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі па ўсёй Беларусі пройдуць у гэтую суботу, 4 жніўня. На сувязь з насельніцтвам выйдуць кіраўнікі ў рэгіёнах і Мінгарвыканкаме. Вынік такога дыялогу — аператыўнае вырашэнне надзённых пытанняў. Зрэшты, ад суботы да суботы колькасць праблемных званкоў скарачаецца.

Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 правядуць:

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Мікалай Васілевіч ТОКАР, тэл. 8 016 221 31 21;

кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ, тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ, тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Алена Аляксандраўна БУБЕНЧЫК, тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ, тэл. 8 022 250 18 69;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Ігар Мікалаевіч МАКАР, тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Ігар Віктаравіч ЮРКЕВІЧ, тэл. 8 017 222 44 44.

ЗНІЗІЦЬ ПАДАТКОВЫЯ НАГРУЗКІ

Праект абноўленага Падатковага кодэкса плануецца ўнесці на разгляд Прэзідэнту да 1 верасня

Як паведаміў намеснік міністра фінансаў Дзмітрый КІЙКО на пасяджэнні Рэспубліканскага клуба дырэктараў, праект новага Падатковага кодэкса размешчаны на сайце Міністэрства фінансаў. Ён накіраваны на ўзгадненне ва ўсе дзяржорганы, бізнес-саюзы, Савет па развіцці прадпрымальніцтва, перадае карэспандэнт БелТА.

«Мы ўжо атрымліваем вынікі ўзгаднення і разам з Міністэрствам па падатках і зборах дзейнічаем у рэжыме аператыўнай дапрацоўкі Падатковага кодэкса. Работа досыць аб'ёмная, а ў нас тэрміны вельмі сціслыя, бо 1 верасня трэба ўносіць дакумент кіраўніку дзяржавы. Унясенне праекта кіраўніку дзяржавы мае на ўвазе, што ён будзе ўзгоднены з Камітэтам дзяржкантролю і Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававых даследаванняў», — адзначыў Дзмітрый Кійко.

З улікам гэтага намеснік міністра заклікаў бізнес-саюзы як мага хутчэй прадставіць свае прапановы па абноўленым Падатковым кодэксе.

Асноўныя змены ў праекце ПК датычацца спрашчэння падатковага адміністравання, прадугледжаны некаторыя механізмы зніжэння падатковай нагрузкі.

■ Класныя навіны

«У школу з усмешкай!»

Акцыю з такой назвай праводзіць з 1 жніўня па 30 верасня Мінскі гарадскі цэнтр сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей. У яе рамках дасведчаныя псіхолагі дадуць бацькам першакласнікаў парады, як дапамагчы дзіцяці хутка адаптавацца да школьнага распарадку дня, уліцца ў новы калектыў, навучыцца спраўляцца з цяжкасцямі.

У мэтах аказання дапамогі першакласнікам і іх бацькам спецыялісты цэнтра будуць праводзіць бясплатныя семінары, трэнінгі і індывідуальныя кансультацыі. Семінары-практыкумы для бацькоў «Гутаркі на школьным парозе» ахопяць такія тэмы, як псіхалагічныя асаблівасці першакласнікаў, школьная сталасць (або псіхалагічная гатоўнасць да школы), цяжкасці, з якімі сутыкаюцца бацькі і настаўнікі ў першыя гады навучання дзяцей, школьная дэзадаптацыя, развіццё і падтрымка ў дзіцяці жадання вучыцца.

Трэнінг для павышэння стрэсаўстойлівасці першакласнікаў «Хачу ў школу!» дапаможа захаваць душэўны і эмацыянальны стан дзіцяці ў норме ў перыяд прывыкання да новых умоў.

Запісацца на семінары, трэнінгі, кансультацыі, а таксама атрымаць больш падрабязную інфармацыю пра акцыю «У школу з усмешкай!» можна па тэлефоне: (017) 317 32 32.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«ЧЫГУНКА — БРАТ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ»

У гісторыка-культурным комплексе «Лінія Сталіна» адкрылася экспазіцыя, прысвечаная працоўнаму і ратнаму подзвігу воінаў-чыгуначнікаў.

У цырымоніі прынялі ўдзел міністр абароны Андрэй Раўкоў, міністр унутраных спраў Ігар Шуневіч, начальнік Беларускай чыгункі Уладзімір Марозаў.

Гістарычная чыгуначная экспазіцыя на тэрыторыі гісторыка-культурнага комплекса «Лінія Сталіна» была створана па ініцыятыве дабрачыннага фонду «Памяць Афгана» Беларускай чыгункай сумесна з Міністэрствам абароны і холдынгам «Белаўтадар».

...Ліпень 1941 года. Чыгуначная станцыя Савецкая. Спякота. Здаецца, звычайны летні дзень, але менавіта тады жыхары гэтых мясцін упершыню пазналі вайну.

Рэканструкцыю падзей пачатку Вялікай Айчыннай вайны правялі ў гісторыка-культурным комплексе. Галоўным аб'ектам стаў адноўлены браняпоезд, які дадаў карціне большай рэалістычнасці.

Як заўважыў **Уладзімір МАРОЗАЎ, начальнік Беларускай чыгункі,** новая экспазіцыя — гэта не проста месца для знаёмства з падзеямі мінулага, а помнік для цэлага пакалення ветэранаў: «Наша чыгунка развівае не толькі эканоміку краіны, але і яе абараназдольнасць. Работнікі чыгункі, як ніхто іншы, у гады ліхалецця знаходзіліся не толькі на працоўнай, але і на баявой вахце. Мы можам гэтым ганарыцца!»

Аляксандр МЯТЛА, воін-інтэрнацыяналіст, палкоўнік у адстаўцы, расказаў пра ідэю стварэння экспазіцыі: «Наша задача ў тым, каб увекавечыць памяць чыгуначнікаў на «Лініі Сталіна». Была праведзена вялікая работа, у якой прымалі ўдзел чыгуначнікі і рэстаўратары. Гады праходзяць, але памяць аб подзвігах чыгуначнікаў павінна захоўвацца. Няхай гэты помнік-браняпоезд стаіць на запасным шляху, як у нас, і ніколі не спатрэбіцца больш у баявых абставінах».

Экспазіцыя ўяўляе сабой тыповую чыгунку даваеннага перыяду: савецкі вакзал, чыгуначныя пуці са стрэлкавым пераводам, чыгуначны мост, піларама, дрывотня і іншыя аб'екты інфраструктуры. Але галоўным з'яўляецца браняпоезд перыяду Вялікай Айчыннай вайны, складзены з паравоза, двух броневагонаў і баявой платформы з зенітнай гарматай. На такія паязды былі ўскладзены важныя функцыі. Пра гэта ўспомніў і **ветэран Вялікай Айчыннай вайны Сямён Еўдакімавіч БЕРАСТНЁЎ:** «Я быў камандзірам стралковага ўзвода на Паўночна-Заходнім фронце. Памятаю і магу сцвярджаць, што чыгунка была родным братам Чырвонай Арміі: усе чакалі, пакуль цягнік прывязе патроны, снарады і ежу...»

Сімвалічна і тое, што недалёка ад «Лініі Сталіна» ў ліпені 1941-га браняпоезд НКУС № 73 уступіў у бой з нямецкай мотапяхотай і танкамі 20-й дывізіі ў ходзе абароны Заслаўя.

Маргарыта ГАЙДАРЖЫ. Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Трамп даручыў разгледзець увядзенне пошлін у 25 % на тавары з Кітая

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп даручыў разгледзець магчымасць увядзення пошлін у 25 % на імпарт кітайскіх тавараў і паслуг на суму $200 млрд. Пра гэта гаворыцца ў заяве гандлёвага прадстаўніка ЗША Роберта Лайтхайзера, паведамляюць інфармагенцтвы.

Паводле яго слоў, увядзенне пошлін у памеры 25 % замест запланаваных раней 10 % ужо абмяркоўваецца, слуханні па гэтым пытанні пачнуцца ў жніўні. ЗША абвінавачваюць Кітай у крадзяжы амерыканскай інтэлектуальнай уласнасці, тэхналогій і ажыццяўленні несправядлівай гандлёвай практыкі. У сувязі з гэтым у чэрвені ЗША ўвялі 25-працэнтныя пошліны на імпартаваныя з Кітая тавары на суму $50 млрд.

Як адзначыў Роберт Лайтхайзер, замест таго, каб прыслухацца да довадаў ЗША і змяніць паводзіны, Кітай увёў меры ў адказ супраць амерыканскіх фермераў і прадпрыемстваў, што закранула 40 % амерыканскага экспарту ў Кітай.

Брытанцы хочуць правесці новы рэферэндум

Больш за 500 тысяч чалавек падпісалі петыцыю ў падтрымку правядзення ў Вялікабрытаніі новага рэферэндуму па пытанні брэксіту, які дазволіў бы грамадзянам краіны выступіць з вырашальным словам у дачыненні да любога з пагадненняў, заключаных з Еўрасаюзам аб далейшым супрацоўніцтве. Пра гэта паведаміла газета The Independent.

Былы міністр адукацыі Джасцін Грынінг, якая падтрымала петыцыю, заявіла, што многія дэпутаты парламента і шэраг высокапастаўленых членаў урада згодныя з тым, што новае галасаванне можа быць адзіным спосабам для выхаду з тупіка брэксіту. The Independent падкрэслівае, што яе кампанію падтрымалі былы брытанскі прэм'ер-міністр Тоні Блэр, лідар партыі «Ліберальныя дэмакраты» Вінс Кейбл і былы генеральны пракурор Дамінік Грыў.

Раней прэм'ер-міністр Тэрэза Мэй адхіліла ідэю правядзення агульнанароднага галасавання па выніковым пагадненні паміж Лонданам і Бруселем па ўмовах брэксіту. «Я не зраблю гэтага, таму што брытанскі народ ужо прагаласаваў. Гэты парламент даў людзям права прагаласаваць, а яны зрабілі свой выбар. І яны хочуць, каб іх урад ажыццявіў іх выбар на практыцы», — сказала Мэй.

Кіеў выказаў пратэст Будапешту пасля «недружалюбных» выказванняў Орбана

Міністэрства замежных спраў Украіны выказала пратэст у сувязі з «недружалюбнымі» выказваннямі прэм'ер-міністра Венгрыі Віктара Орбана наконт еўрапейскіх і еўраатлантычных памкненняў Кіева. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе знешнепалітычнага ведамства.

28 ліпеня Орбан, выступаючы ва ўніверсітэце Румыніі, заявіў, што не верыць у рэалістычнасць таго, што Украіна можа стаць членам Еўрапейскага саюза і НАТА. На думку МЗС Украіны, такія заявы прэм'ера дысануюць з палітыкай ЕС, а таксама сведчаць аб выбары Венгрыяй шляху канфрантацыі замест супрацоўніцтва і з'яўляюцца прамым умяшаннем ва ўнутраныя справы Украіны.

«Украіна хоча атрымаць афіцыйныя тлумачэнні ў сувязі з рашэннем урада Венгрыі стварыць пасаду ўпаўнаважанага міністра, адказнага за развіццё Закарпацкай вобласці і праграму развіцця дзіцячых садоў Закарпацця, паколькі ў сферу кампетэнцыі ўпаўнаважанага аднесена частка суверэннай тэрыторыі Украіны», — дадалі ў ведамстве.

■ Навука

ДЫЯГНОСТЫКА — НА НОВЫМ ТЭХНАЛАГІЧНЫМ УЗРОЎНІ

Інстытут прыкладной фізікі НАН Беларусі сумесна з кластарам медыцынскага, экалагічнага прыборабудавання і біятэхналогій пры ўрадзе горада Санкт-Пецярбурга распрацавалі праект Канцэпцыі новай навукова-тэхнічнай праграмы Саюзнай дзяржавы «Стварэнне інавацыйнай апаратуры для экспрэс-дыягностыкі сацыяльна значных захворванняў у месцы знаходжання пацыента» («ЛАБТЭХ»).

Мэтай праграмы з'яўляецца стварэнне цэлай лінейкі найноўшых прыбораў і тэст-сістэм для хуткай дыягностыкі і ацэнкі стану чалавека ў прыёмных аддзяленнях бальніц, у раённых паліклініках, офісах сямейных урачоў, а таксама для правядзення шырокага кола біяхімічных аналізаў. Сярод задач значыцца распрацоўка тэхналогій серыйнай вытворчасці сродкаў трансдэрмальнай дастаўкі лекавых прэпаратаў на аснове мікраіголак, адаптаваных да ўмоў аказання неадкладнай дапамогі, а таксама методык правядзення дыягнастычных працэдур і выканання вымярэнняў.

Асобным мерапрыемствам выдзелена распрацоўка нарматыўнай базы прымянення неінвазіўнай і інвазіўнай экспрэс-дыягностыкі ў сістэме аховы здароўя Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь, што дасць магчымасць выкарыстоўваць вынікі ў абедзвюх краінах раўнапраўна. На думку распрацоўшчыкаў праграмы, гэта дазволіць вырашыць шэраг пытанняў у галіне мікрабіялогіі і эпідэміялогіі, анкалогіі, кардыялогіі, таксікалогіі і г. д.

Запланаваныя работы не дублююць распрацоўкі, якія выконваюцца рознымі прадпрыемствамі дзяржаў — удзельніц Саюзнай дзяржавы ў рамках нацыянальных навукова-тэхнічных праграм і нацэлены на імпартазамяшчэнне.

Плануецца, што ўдзельнікамі новай праграмы Саюзнай дзяржавы з боку нашай краіны стануць шэраг арганізацый НАН Беларусі, Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства адукацыі і іншых ведамстваў.

З боку Расіі мяркуецца ўдзел НДІ грыпу Міністэрства аховы здароўя Расійскай Федэрацыі (гэта галаўная арганізацыя па праграме), а таксама цэлага шэрагу арганізацый, якія маюць шматгадовы вопыт стварэння медыцынскіх дыягнастычных прыбораў і абсталявання.

Праграму плануецца рэалізаваць за чатыры гады ў адзін этап. Цяпер праект канцэпцыі праграмы прахадзіць разгляд у зацікаўленых міністэрствах і ведамствах.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ Падрабязнасці

Смяротна небяспечная паездка

Забойства трох расійскіх журналістаў у Цэнтральна-Афрыканскай Рэспубліцы — расказваем, што вядома на момант падпісання нумара.

У апошні дзень ліпеня ў ЦАР — адной з самых бедных краін свету, дзе пастаянна не хапае ежы і вады, а таксама адбываюцца ўзброеныя сутыкненні, — былі знойдзеныя мёртвымі грамадзяне Расіі — рэжысёр-дакументаліст Аляксандр Растаргуеў, ваенны карэспандэнт Архан Джамаль і аператар Кірыл Радчанка. Следчы камітэт Расійскай Федэрацыі распачаў крымінальную справу па артыкуле «Забойства».

Целы і абстрэлены аўтамабіль былі знойдзеныя на поўначы краіны, недалёка ад горада Сібю, што за 180 кіламетраў ад Бангі, сталіцы ЦАР. Як паведаміла агенцтва Associated Press, расіян атакавалі дзесяць чалавек паміж дзвюма вёскамі за 23 кіламетры ад горада. Гэтыя людзі былі ў турбанах і размаўлялі толькі на арабскай мове, заявіў прадстаўнік улад горада Сібю Марсэлен Ёё.

Што расіяне рабілі ў сэрцы Афрыкі? Па першых звестках, яны прыехалі, каб зняць дакументальны фільм пра дзейнасць прыватных расійскіх ваенных кампаній у Цэнтральна-Афрыканскай Рэспубліцы. Журналісты накіроўваліся на сустрэчу з кансультантам з місіі ААН, які б дапамог з арганізацыяй здымак.

Пазней «Цэнтр кіравання расследаваннямі» (гэта арганізацыя курыравала праект) апублікаваў у «Фэйсбуку» ўсю наяўную ў іх інфармацыю аб дэталях паездкі. У ёй устаноўлены апошнія дні журналістаў: 29 ліпеня яны спрабавалі трапіць на базу Берэнга, але ў іх запатрабавалі дазвол ад Міністэрства абароны ЦАР. Наступнай мэтай групы павінен быў стаць горад Бамбары, дзе і была прызначана сустрэча з кансультантам з ААН. Ён павінен быў даць інфармацыю не толькі па сітуацыі з расійскімі інструктарамі ў ЦАР, а таксама дапамагчы са здымкамі залатых прыіскаў Ндасіма.

Колькасць інфармацыі аб тым, што адбылося, павялічваецца з кожнай гадзінай. Як паведаміў «Інтэрфаксу» кіраўнік «Цэнтра кіравання расследаваннямі» Андрэй Каняхін, здымачная група трапіла ў краіну па турыстычных візах, пра што таксама заявіў і МЗС Расіі. Яны не акрэдытоўваліся ў расійскім пасольстве і консульстве. Акрамя таго, пазней стала вядома, што па нявысветленых прычынах аўтамабіль з расіянамі адхіліўся ад першапачатковага маршруту паездкі, якая ў выніку стала фатальнай.

Па словах Каняхіна, магчыма, здымачная група шукала начлег: апошні КПП аўтамабіль праехаў увечары. Так група апынулася на тэрыторыі, якую кантралююць мусульманскія групоўкі.

Выданне Palmares Centrafrique паведаміла, што расіян спачатку выкралі і катавалі, а не адразу забілі на месцы. Афіцыйны прадстаўнік МЗС Расіі Марыя Захарава абвергла гэтыя звесткі: па яе словах, пры першасным аглядзе цел мясцовыя ўрачы не выявілі слядоў катаванняў, толькі агнястрэльныя раненні.

Акрамя таго, ТАСС са спасылкай на заяву ўлад ЦАР па радыё паведаміў, што журналісты маглі быць забітыя баевікамі мусульманскага паўстанцкага руху «Селека».

Больш падрабязную інфармацыю паведаміў кіроўца, які быў паранены, але здолеў збегчы. Гэта была засада на трасе. Першая версія таго, што адбылося, — рабаванне, у забітых было мноства дарагой тэхнікі, а таксама буйная сума грошай.

Пазней з'явіліся новыя падрабязнасці: міністр па пытаннях СМІ і камунікацый, прэс-сакратар урада краіны Анж Максім паведаміў РБК, што ў журналістаў сапраўды ўкралі грошы і абсталяванне, а таксама дакументы. Узброеныя людзі запатрабавалі ад здымачнай групы аддаць ім аўтамабіль, на што атрымалі адмову. Адзін з расіян аказаў супраціўленне, за што яго застрэлілі на месцы. Астатнія памерлі ад атрыманых раненняў.

Знаходзіцца ў Цэнтральна-Афрыканскай Рэспубліцы — гэта сапраўды вельмі небяспечна. Як паведамляе medusa.io, сёння там пастаянна адбываюцца ўзброеныя сутыкненні паміж як мінімум 14 групоўкамі, а дзяржаўная ўлада кантралюе ад сілы пятую частку тэрыторыі ЦАР.

Целы загінулых даставяць у Расію заўтра.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ

■ Надвор'е

Пасвяжэе толькі на наступным тыдні

Тэмпературны фон у першы дзень месяца перавысіў кліматычную норму на 2—6 градусаў, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У найбліжэйшыя дні захаваецца спякотнае надвор'е, але не абыдзецца без кароткачасовых навальнічных дажджоў. Толькі на наступным тыдні спякота спадзе.

У суботу, 4 жніўня, у асобных раёнах краіны чакаюцца кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Уначы — 13—19 градусаў вышэй за нуль, удзень — 24—30 градусаў цяпла. Такі ж тэмпературны фон захаваецца і ў нядзелю, 5 жніўня. Днём у асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. У панядзелак, 6 жніўня, атмасферны фронт, які перамяшчаецца з Балтыйскага мора, прынясе кароткачасовыя дажджы, навальніцы, якія будуць суправаджацца парывістым ветрам. Тэмпература паветра ўначы складзе 12—18 градусаў вышэй за нуль, днём будзе ад плюс 22 градусаў па поўначы да 28 градусаў па поўдні краіны.

У аўторак, 7 жніўня, надвор'е абумовіць няўстойлівая паветраная маса, якая паступае з Балтыйскага мора. Месцамі, пераважна па паўночнай частцы краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы чакаецца 11—17 градусаў вышэй за нуль. Днём будзе 20—25 градусаў цяпла, у паўднёва-заходніх раёнах краіны паветра прагрэецца да 27 градусаў.

■ Новыя кнігі

ДУХОЎНЫ ЗАПАВЕТ СКАРЫНЫ

На мінскім паліграфкамбінаце імя Якуба Коласа пабачыла свет трэцяе, дапоўненае выданне анталогіі «Францыск Скарына на мовах народу свету».

Праз 65 моў вядзе свой дыялог вялікі асветнік, першадрукар з грамадзянамі розных краін. «Як звяры, // што блукаюць у пушчы, // ад нараджэння // ведаюць сховы свае, // як птушкі, // што лётаюць у паветры, // помняць // гнёзды свае, // як рыбы, // што плаваюць у моры і рэках, // чуюць // віры свае // і як пчолы // бароняць вуллі свае — // гэтак і людзі // да месца, дзе нарадзіліся // і ўзгадаваны ў Бозе, // вялікую ласку маюць», — гэты пераклад на сучасную беларускую мову ўрыўка са скарынаўскай прадмовы да кнігі «Юдзіф» належыць лаўрэату Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Алесю Разанаву.

У кнізе змешчаны і іншыя пераклады на беларускую мову неўміручых радкоў Францыска Скарыны — Сяргея Панізніка, Івана Саверчанкі. Дарэчы, і на некаторыя іншыя мовы ў анталогіі — па некалькі перакладаў: на рускую (Уладзіміра Беразева, Алега Буркіна, Валерыя Грышкаўца), крымска-татарскую, марыйскую, нямецкую (ажно чатыры пераклады!), сербскую, удмурцкую, чэшскую. Сярод перакладчыкаў — вельмі вядомыя ў сваіх краінах, сваіх рэгіёнах літаратары. Як, напрыклад, кітайскі перакладчык Гао Ман (на жаль, ён памёр у кастрычніку 2017 года). Саюзам пісьменнікаў Беларусі ён адзначаны знакам «За вялікі ўклад у літаратуру». Гао Ман — перакладчык на кітайскую мову твораў народнага паэта Беларусі Максіма Танка, лаўрэата Нобелеўскай прэміі Святланы Алексіевіч. Пісьменнік з Пекіна быў знаёмы з народным мастаком СССР Заірам Азгурам, сустракаўся з народным паэтам Беларусі Рыгорам Барадуліным. Гао Ман намаляваў каліграфічныя партрэты Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Танка, Васіля Быкава, Алеся Адамовіча, Святланы Алексіевіч, Навума Гальпяровіча. Рэпрадукцыі гэтых работ друкаваліся ў беларускіх перыядычных выданнях.

Сяргей ШЫЧКО

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

Матацыклістка збіла малое дзіця

Студэнтка на матацыкле збіла пяцігадовага хлопчыка ў Стаўбцоўскім раёне, паведамілі ва УДАІ УУС Мінскага аблвыканкама.

Аварыя здарылася прыблізна ў 17.00 у вёсцы Налібакі. 19-гадовая жыхарка Дзяржынска на матацыкле «Мінск» збіла дзіця, якое раптоўна выбегла з дваровай тэрыторыі ў непасрэднай блізкасці ад транспартнага сродку. Хлопчык з пераломамі быў шпіталізаваны ў рэанімацыйнае аддзяленне. Матацыклістка была цвярозая. Тэхагляд у яе быў пройдзены.

Перакуліўся аўтобус...

Чарговае за апошнія дні здарэнне на дарозе з удзелам аўтобуса: турыстычны транспартны сродак міжнародных зносін перакуліўся ў Аршанскім раёне.

Па інфармацыі аддзялення агітацыі і прапаганды ДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама, інцыдэнт з аўтобусам міжнародных зносін Кіеў—Талін, у салоне якога знаходзіліся 53 чалавекі — грамадзяне Украіны, Малдовы і Расіі, — адбыўся ранкам, у 4.30. Як мяркуецца, кіроўца заснуў за рулём і наехаў на светлавую апору, пасля чаго аўтобус перакуліўся на бок у кювет па ходзе руху. Па словах медыкаў, сур'ёзных траўмаў у аварыі ніхто з пацярпелых не атрымаў і ў шпіталізацыі не мае патрэбы.

Выратавалі з Ведзьмы буслянят

У Ляхавічах ратавальнікі дасталі з ракі Ведзьма трох буслоў.

У дзяжурную часць ранкам звярнулася мясцовая жыхарка. Пераходзячы цераз мост, яна ўбачыла ў рацэ саслабелых птушанят бусла. На месца выехалі супрацоўнікі МНС. Яны дасталі з вады буслянят, якія ўжо выбіліся з сіл, і перадалі іх у ветэрынарную лячэбніцу. Птушкі ўжо аклямаліся, бачных пашкоджанняў у іх не выяўлена.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У БАСЕЙН — ДА ГОДА, НА КАНЯ — З ЧАТЫРОХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Задумваючы адпачынак, бацькам неабходна ўлічваць і свае навыкі.

— Тое, якім вырасце малое, закладваецца ў дзяцінстве, у тым ліку і тым, як яно бавіць час, бо на развіццё ўплывае і асяроддзе. Хтосьці лічыць, што можна сядзець суткамі з тэлефонам у руках і такім чынам развівацца. Хтосьці выбірае кнігі з трох месяцаў і размовы, — разважае **Ірына ФРАНЦКЕВІЧ, педагог-псіхолаг сацыяльна-педагагічнага цэнтра Партызанскага раёна Мінска.** — Плануючы нейкае мерапрыемства для дзіцяці, бацькі павінны ўсвядоміць для сябе яго мэту: хочуць яны такім чынам даць малому нейкі новы вопыт і веды, каб надаць штуршок для далейшага развіцця, ці проста адпачыць і набрацца эмоцый.

Кожны раз трэба ўпэўніцца, ці адпавядаюць правілы бяспекі інтарэсам дзіцяці. Не варта адпраўляцца з немаўлём у далёкія падарожжы.

— Безліч мікробаў і інфекцый можна падхапіць у аэрапорце, бо ў дзетак да года яшчэ няма імунітэту, яны не прышчэпленыя, — засцерагае **Наталля МЫСЛІЎЧЫК, галоўны ўрач 36-й гарадской паліклінікі.** — Тое ж датычыцца і развівальных гурткоў. Не трэба нагружаць малых да трох гадоў. У іх яшчэ няма ўседлівасці, ім цяжка канцэнтравацца больш за 15 хвілін. Калі дзіця ўжо само выкажа цікавасць да нейкіх заняткаў, варта аддаваць яго ў пэўную секцыю, але гэта здарыцца не раней за пяць гадоў. Дайце дзецям проста жыць! Да спартыўных секцый трэба таксама падыходзіць з розумам, арыентуючыся на магчымасці дзіцяці. Ёсць фізічна развітыя малыя, яны рана пачынаюць поўзаць і хадзіць, а калі яны толькі пайшлі пасля года, куды іх ставіць у тры гады на канькі...

Працірайце 3D-акуляры

Пасіўны адпачынак у выглядзе мульцікаў у кінатэатры раней за тры гады малым лепш не прапаноўваць, а на сеансы з моднымі 3- і 4-D-тэхналогіямі ўвогуле лепш не вадзіць дзяцей да шасці гадоў, лічаць спецыялісты.

— Мы атрымліваем інфармацыю пра сусвет адразу праз абодва вокі. А праз акуляры 3D у кожнае вока звесткі трапляюць паасобку і аб'ядноўваюцца ў суцэльную карцінку толькі ў мозгу. Для малога да шасці гадоў гэта найманейшая нагрузка, якая ўплывае на зрок і мозг, тым больш што дзіцячыя 3D-акуляры ёсць далёка не ва ўсіх кінатэатрах. А прылада не па памеры гэтую нагрузку падвойвае, — разважае псіхолаг.

Перш чым весці малога ў кіно ці тэатр, трэба думаць, ці вытрымае ён прадстаўленне, і на які ўзрост яно разлічана, раіць урач. Калі хочацца паглядзець любімы мультфільм на вялікім экране, трэба прыняць меры перасцярогі. Выбраць месца, дзе ёсць дзіцячыя акуляры, праверыць, каб на іх не было драпін, працерці лінзы вільготнай сурвэткай. І напачатку прагляду хоць бы 5—10 хвілін паназіраць, як малы ўспрымае карцінку, як дыхае, рэагуе эмацыянальна. Пасля сеансу добра абмеркаваць з дзіцем, як паводзілі сябе героі, ці правільна яны рабілі, і вось ужо пасіўны адпачынак ператвараецца ў карысную сацыялізацыю. З іншага боку, тэлевізар, які, здараецца, працуе проста шумавым фонам, — гэта вельмі дрэнна. А пасля мы здзіўляемся, адкуль дзіця ведае нейкія рэчы і словы.

Гаджэты, лішняя вага і скаліёз

Дзіця развіваецца, калі яно праяўляе дапытлівасць. Калі ж малы сядзіць з планшэтам у руках і ціснe на кнопкі ці гуляе ў «стралялкі», у яго застаецца толькі цікавасць, але ж адсутнічае дапытлівасць, а гэта крок назад у развіцці. Нездарма ў Амерыцы падумваюць увогуле забараніць выкарыстанне такіх гаджэтаў да 12 гадоў, бо цяпер у іх кожнае трэцяе дзіця да двух (!) гадоў гуляе з тэлефонам ці планшэтам. Хоць ужо ёсць даследаванні, што тыя, хто атрымаў цацку-тэлефон да трох гадоў, праз доўгае нерухомае сядзенне ў сем ужо могуць атрымаць затрымку кагнітыўнага развіцця, лішнюю вагу, нескардыянаванасць рухаў, скаліёз.

— Чым пазней малы пазнаёміцца з гульнямі на планшэтах, тым лепш. Я б да шасці гадоў не давала дзіцяці ніякіх гаджэтаў. Праз іх малыя не развіваюць сацыяльныя ўменні, як гэта адбываецца, калі яны забаўляюцца з лялькамі, машынкамі, канструктарам, пазламі, — падкрэслівае Ірына Францкевіч. — Пастаянная гульня з гаджэтамі адбірае ў дзіцяці рэальны свет і замяняе яго. Адмаўляюцца стасункі з бацькамі і равеснікамі, дзеці не ўмеюць сацыяльна дзейнічаць, нават не хочуць вучыцца ў школе.

З іншага боку, немагчыма развіць дапытлівасць малога мэтавымі ўстаноўкамі «Глядзі! Гэта цікава!». Заахвоціць да чагосьці можна толькі праз уласны прыклад. Захопленыя бацькі — захопленае дзіця.

— Каб гаджэт прынёс карысць, можна гуляць у ім у пазнавальныя, стратэгічныя і развівальныя гульні, прычым дазіравана. Яго можна выкарыстоўваць для пошуку цікавай інфармацыі. Паглядзець, як называецца ліст з дрэва, які знайшлі на прагулцы, адшукаць для матулі рэцэпт нейкай стравы, — мяркуе псіхолаг.

Цырк, заапарк, лес, вуліца

Каб даць дзіцяці якасны адпачынак, бацькі самі павінны развівацца і вывучаць прапановы. Хочаце павесці малога ў кантактны заапарк — калі ласка. Але падумайце, ці не ўкусіць пушысты кролік малога за палец. Або наадварот — малы проста з-за цікаўнасці пачне тыкаць жывёлам у вочкі ці цягаць іх за вушы. Тады дзіця атрымае адваротны вопыт — панічны страх звяроў, папярэджвае Ірына Францкевіч:

— Малых варта прыводзіць у заапарк, асабліва кантактны, калі ў іх ужо склаліся паняцці спачування і клопату. Перш чым ісці да звяроў, трэба пазнаёміцца з імі на малюнках, расказаць, што яны любяць, а чаго баяцца. Растлумачыць гэта раней за тры гады амаль немагчыма.

Нават у цырк з малымі напачатку лепш хадзіць на прадстаўленні, дзе шмат жывёл, бо астатнія нумары разлічаны ўжо больш на школьнікаў.

Актыўны адпачынак з дзецьмі таксама можна смела пачынаць з ранняга ўзросту. Калі бацькі ўпэўнены, што справяцца з камарамі і сонечнай гарачынёй, — калі ласка, хоць з паўгода бярыце дзіця з сабой на рыбалку.

— Калі мама ўпершыню адпраўляецца ў вела- ці пешы паход з малым, яна не можа ўявіць і прадбачыць многіх здарэнняў. Калі ж бацькі першапачаткова актыўна адпачывалі, яны спакойна могуць далучаць дзіця да свайго ладу жыцця з маленства, — разважае Наталля Мысліўчык. — Займацца верхавой яздой лепш пачынаць гадоў з 5—6. Проста пакатацца на поні, калі дзіця не баіцца, можна і ў два з паловай гады, аднак на дарослага каня раней за чатыры гады лепш не караскацца.

Сучасныя актыўныя гульні накшталт лазертага, пейнтбола, бампербола — гэта адпачынак для падлеткаў гадоў з дзесяці. Гэта гульні-стратэгіі, якія развіваюць і мысленне, і спрыт, і моц. Бацькам пры гэтым трэба ўпэўніцца, што ў такіх клубах вытрыманы ўмовы бяспекі.

— Не старайцеся занадта апекаваць малых і навязваць ім шмат рознага адпачынку, каб яны не раслі інфантыльнымі. Проста пагойсаць па вуліцах чародкамі ім таксама трэба, — раіць урач. — Актыўнасць — добра для здароўя дзіцяці. А шмат тэлевізара, шмат тэлефона, няправільнае харчаванне вядуць да гіпадынаміі (аслаблення мышачнай дзейнасці), міяпіі (парушэнне зроку), атлусцення. Цяпер 10 дзяцей з 30 ужо тлустыя.

Адным словам, колькі ні разважай, а адпачынак у кожнага дзіцяці павінен быць свой, бо ўспрымае яно сусвет індывідуальна, аднак толькі бацькі вызначаюць межы гэтай індывідуальнасці.

Ірына СІДАРОК.

ЗА 100 ДОЛАРАЎ — ПА ЎСІМ СВЕЦЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Што датычыцца Прагі, то ёсць такі лайфхак: у ёй ёсць фірма, у якой працуюць студэнты, што навучаюцца быць экскурсаводамі. У іх вельмі танныя білеты, а экскурсіі добрыя. Таксама былі і ў Вене, сталіца Аўстрыі, а там усё вельмі дорага. Таму прыехалі ў яе з Прагі а 6-й раніцы і з'ехалі а гадзіне ночы, каб грошай лішніх не траціць.

Мы тады акурат ехалі праз горад Брно, што ў чэшскім гістарычным рэгіёне Маравія. Калі дзесьці бываеш, то ёсць звычай кінуць у вадаём манетку, каб вярнуцца. Калі мы там былі, я ўзяў з кішэні не адну манету, а жменю дробных і кінуў іх у вадаём. Штук дзесяць, напэўна. Зрабіў гэта, бо так прынята. А пасля я ў гэтым Брно аказваўся яшчэ восем разоў. Вось і не вер у прыкметы! Таму пастаянна ўсіх перасцерагаю лішні раз падумаць, ці хочаце вы ў гэтае ж месца вярнуцца. Я добра стаўлюся да Брно, там цудоўны тэхнічны ўніверсітэт, але пабываць дзевяць разоў у адным горадзе...

— Але ж гэта мусіць так дорага каштаваць...

— У 2010 годзе я пераехаў у Маскву і адкрыў для сябе свет лаўкостаў. Гэта бюджэтныя авіякампаніі, якія прапануюць вельмі нізкую плату за авіяпералёт у абмен на адмову ад большасці традыцыйных пасажырскіх паслуг. Калі ж дадатковы сэрвіс прысутнічае, як правіла, яго кошт супастаўны з коштам білета. І толькі тады зразумеў, што гэты спосаб перамяшчэння больш даступны беларусам, чым расіянам, таму што Літва і Польшча, куды кампаніі-лаўкосты лятаюць, да нас бліжэй.

З такім пералётам вандроўка аказваецца вельмі таннай. Нядаўна ездзіў у Капенгаген, быў там чатыры дні, і ўся вандроўка абышлася ў 100 долараў з пералётам уключна.

— Якімі сэрвісамі па пошуку зніжак лепей карыстацца?

— Мне падабаецца сайт vandrouki.by. Там можна паглядзець, дзе якія акцыі і зніжкі ёсць: і на пералёты, і на пражыванне, і нават на кавярні. Зручна, што гэта інфармацыя акумулявана ў адным месцы.

Напрыклад, дзякуючы гэтаму сайту атрымалася заказаць таннае жыллё ўзімку ў Осла. Так атрымалася, што з Каўнаса, што ў Літве, датуль вельмі нязручна вылятаюць самалёты. Я туды прыехаў у гадзіну ночы, а самалёт адлятаў а пятай раніцы. Думаў, што прасяджу гэты час на аўтавакзале, але ў ім зала чакання была зачынена на рамонт. Я тады пайшоў пехатой да аэрапорта. А гэта каля 15 кіламетраў. Па аўтастрадзе 13 кіламетраў прайшоў, а пасля мяне да сябе ў машыну ўзяла дзяўчына. Яна літоўка і была здзіўлена, што я пешшу прайшоў такую адлегласць. «Ты так любіш хадзіць?» — запытала яна. Давялося тлумачыць сітуацыю і ўпэўніваць, што не заўжды абавязкова браць трансфер і няма нічога дзіўнага ў тым, каб у малазнаёмым месцы прайсціся па раней невядомым маршруце.

— А як звычайна арыентуешся ў месцы, у якое трапіў упершыню?

— Карту ў папяровым выглядзе ў Еўропе заўжды можна ўзяць бясплатна ў офісах турызму. Так я рабіў раней. Цяпер усё значна прасцей: можна спампаваць на тэлефон карту і нават без інтэрнэту, а з дапамогай толькі GPS пракладаць маршрут.

— Загадзя плануеш, куды паедзеш?

— Да вандровак я стаўлюся лёгка, ехаць куды-небудзь вырашаю спантанна. У маі пабачыў, што білеты з Будапешта да Скоп'я каштуюць усяго 20 еўра. Набыў. А як даехаць да Будапешта? Шукаў перакладныя і знайшоў праз Браціславу.

— У які бюджэт звычайна ўкладаешся?

— Вандраваць напрацягу 4-5 дзён меней чым за 100 еўра — цалкам нармальна. На дадзены момант я быў у 31-й краіне. Наведваю 4-5 новых краін у год. У асноўным гэта Еўропа. Таму калі і карыстаўся візай, то толькі шэнгенскай.

— Як вандруеш: адзін ці з кампаніяй?

— Вандраваць я прызвычаіўся адзін, хоць зручней гэта рабіць з кампаніяй. А вось удваіх з дзяўчынай ездзіць складаней, бо і выдаткаў болей, і патрабаванняў у яе больш. Калі я адзін, то раней спыняўся ў хостэлах, дзе па 16 ложкаў у пакоі. Зараз стараюся спыняцца там, дзе іх хоць бы 4—6. Але вельмі высокая магчымасць таго, што і ў такім пакоі трапіцца карэец ці японец, які ўсю ноч будзе па месенджарах расказваць, як ён дзень правёў. Пад такі акампанемент амаль немагчыма заснуць. Хтосьці можа пачаць спяваць ноччу. Са мной і такое здаралася.

Зараз вельмі папулярнымі становяцца капсульныя хостэлы. Гэта адзін з варыянтаў японскіх атэляў, які ўяўляе сабой невялікія спальныя ячэйкі, размешчаныя адна над адной. І калі ў Расіі гэта штосьці моднае і таму дарагое, то ў іншых краінах наадварот — танны і зручны варыянт пераначаваць.

2011 год. Палацава-замкавы комплекс Карматэн — адзін з замкаў Бургундыі (рэгіён у Францыі).

Таксама можна скарыстацца сайтам CouchSurfing. Члены сеткі прадстаўляюць адзін аднаму дапамогу і начлег падчас падарожжаў, а таксама паказваюць горад. Аднак я гэтым рэсурсам рэдка карыстаюся, бо ў мяне няма магчымасці прымаць у сябе гасцей, магу толькі сам спыняцца дзе-небудзь. Але ў мяне шмат сяброў, якія часам прымаюць у сваіх мінскіх кватэрах гасцей.

— А бывала так, каб не было дзе спыніцца?

— Нават калі падавалася, што так, усё адно адбываліся прыемныя нечаканасці і праблемы вырашаліся. Галоўнае разумець, што з любой, нават самай кепскай сітуацыі, ёсць выйсце.

Вераніка ПУСТАВІТ.

КАБ РЫБКУ З'ЕСЦІ, У ВАДУ ТРЭБА ЎЛЕЗЦІ

Студэнткі медвучылішча Ліда і Маша, вядома ж, чулі гэтую прыказку, а прыехаўшы ў вёску на практыку, яшчэ і ўбачылі: дзядзька Мірон, сусед іхняй кватэрнай гаспадыні, штораніцы садзіўся ў лодку, адплываў ад берага, закідваў вудачкі і — як той штукар — выцягваў рыбку за рыбкай.

— Хто вучыў вас так спрытна лавіць? Вы, мусіць, сакрэт нейкі маеце? — захапляліся ім практыканткі.

Дзядзька ў адказ задаволена ўсміхаўся ды нёс свой улоў дадому.

А дзяўчатам жа таксама рыбкі хацелася. «Вось бы налавіць, — думалі яны, — але чым?»

Вудачкі — хутка згледзелі — дзядзька дадому не носіць: хавае ў бульбе, у канцы сваіх сотак, лодка таксама — проста прывязана. А сам рыбак у суботу з'ехаў у горад...

Такім момантам грэх было не скарыстацца: Маша «нырнула» ў бульбоўнік, Ліда «ўзяла на пракат» дзядзькаву лодку. Удзвюх яны выплылі на сярэдзіну ракі, закінулі вуды — падрыхтаваліся выцягваць рыбу (як дзядзька — адну за адной), але яе нідзе не было — нават завяду. (Пра тое, што на кручок трэба насаджваць чарвяка, сяброўкі не ведалі.)

Праўда, адна з іх праз нейкую гадзіну ўспомніла, што брат, каб прынадзіць рыбу, кідаў у ваду шарыкі, скачаныя з хлебнага мякішу з дабаўленнем борнай кіслаты.

Прыйшлося збегаць у вёску па ўсё патрэбнае, вакол лодкі раскідаць прынаду. І хутка ўбачыць, што яна «спрацавала»: побач сталі з'яўляцца рыбкі, хапаць размоклы пачастунак, імгненна знікаць у глыбіні і праз нейкі час усплываць на паверхню. Дзяўчаты пашкадавалі, што ў іх з сабою сачка няма...

І амаль тут жа заўважылі шматлікіх «канкурэнтаў»: да іх лодкі з усіх бакоў сталі злятацца чайкі. Хапаючы рыбак, яны з крыкам кружылі над галовамі дзяўчат...

Тыя — прыезджыя, на «пазычанай» лодцы, з чужымі вудамі — ну вядома ж, не хацелі прыцягваць увагу вяскоўцаў: прыйшлося хуценька прычаліць да берага, пакласці на месца вуды ды пабегчы дамоў, дзе іх ужо чакала... поўная патэльня ляшчоў. Цётка Ганна насмажыла, кватэрная гаспадыня. А прынёс іх дзядзька Мірон — каб пачаставаць такіх прыгожых ды прывятлівых дзяўчат.

...Запрашаць іх да стала доўга не прыйшлося: елі са смакам і яшчэ больш хвалілі дзядзьку, бо цяпер даклад-на ведалі, што рыбалка — справа вельмі няпростая.

Трохі прасцей хіба «злавіць»... рыбакоў, калі маеш «кручкі» ў выглядзе маладосці, прыгажосці і той жа добразычлівасці.

Таццяна Чэкед,
г. Гомель.

ПАЦЕХА З МЕХА

«Маладыя гады, маладыя жаданні!..»

Чым далей адступаюць яны ў мінулае, тым часцей прыходзяць на памяць.

Такім чынам — армейская служба, ранішні агляд. З вялікага шэрагу салдат камандзір узвода выклікае траіх і паведамляе, што нас — Саньку Бялова, Андрэя Банько і мяне — адпраўляюць (вушам не верым!) у камандзіроўку (!) — у горад Ташкент, праз Самарканд.

Ад такой навіны мы ледзь не падкідаем фуражкі, не крычым «ура!», бо што і казаць — стаміліся ад шэрай аднастайнай штодзённасці, ад казармы, хацелі хоць якіх-небудзь змен, хоць нейкіх уражанняў.

І вось яны, можна сказаць, пачаліся: раніцай наступнага дня хуткі цягнік прывёз нас у Самарканд, і там з дазволу камандзіра мы пайшлі ў горад.

Першым, каго сустрэлі на бліжэйшым аўтобусным прыпынку, быў дзядок, як дзве кроплі вады падобны на Хатабыча (ды і на нашых дзядуляў таксама!). Ва ўсякім разе, калі спыталі ў яго, дзе тут блакітныя купалы, пра якія ва ўсю тады спяваў ансамбль «Ялла», ён падахвоціўся не толькі расказаць пра іх, але і паказаць дарогу.

Разам з ім мы прайшлі крыху па вузкім завулку і — літаральна — аслупянелі: тыя блакітныя купалы вежаў Рэгістана зліваліся з такім жа блакітам бяздоннага ўзбекскага неба... А ўжо арнаменты на старажытных сценах... А ўжо карціны з мазаікі...

Цэлы дзень, задраўшы галовы, мы хадзілі па горадзе — любаваліся, захапляліся, стараліся ўсё запомніць. Потым завіталі ў чайхану, пакаштавалі там сакавітых мантоў і папілі духмянай гарбаты...

Назад вярталіся тым самым завулкам, які паказаў Хатабыч, і ў цьмяным святле ліхтароў (на ўсходзе цямнее хутка) убачылі тамтэйшых жанчын-гандлярак. «Цікава, што яны прадаюць?» — спытаў нехта з хлопцаў. А захацелі паглядзець — падаліся ў іх бок, — тыя, як спужаныя птушкі, усхапіліся, ускінулі на плечы нейкія мяхі і з імі сталі... уцякаць.

— Пастойце... Куды вы? — не зразумелі мае саслужыўцы і... пабеглі за імі.

Не ведаю, чаму, але я застаўся стаяць.

Хвілін праз колькі ўсе ўцекачы вярнуліся на месца, прычым з дружным гучным смехам. Высветлілася, што жанчыны гандлявалі семкамі, як водзіцца, у недазволеным месцы; нас прынялі за работнікаў міліцыі, якія могуць штрафу ўляпіць...

А таму на радасцях, што мы не яны (то-бок салдаты — не міліцыянеры), узбечкі сталі нас частаваць:

— Бярыце, ешце на здароўе, — казалі хлопцам.

Поўную фуражку семак — як ні адмаўляўся — насыпалі і мне, бо прынялі... за камандзіра, за вялікую шышку (яны казалі «шапку»)... Хоць насамрэч я быў проста нашмат вышэйшы за сваіх саслужыўцаў і трохі цяжэйшы на пад'ём. Усход, карацей, справа тонкая.

Генадзь Мішчук,
в. Вотчына,
Маларыцкі раён.

ПОЛЕ... БЕЗ ЦУДАЎ

Ведаеце, якая розніца паміж Ізем і Юзем?

Калі нехта памарудзіў з адказам, я падкажу: тым, што Ізя спачатку думае, а потым робіць, а Юзя — наадварот.

Вось і я — акурат, як ён, як Юзя. Гадоў з 20 таму пачуў па тэлевізары, што на «Поле цудаў» можна прысылаць іспанскія крыжаванкі і тут жа загарэўся ідэяй: стаў, што называецца, збіраць інфармацыю, каб скласці, каб намаляваць сваю, даслаць на праграму, а там...

Не буду казаць, што спаў і бачыў сябе ў якасці гульца за чароўным барабанам. Але ж пакруціць яго — ахвоту меў. Да таго ж у той час, дачытваючы раман Фейхтвангера «Гоя, або Цяжкі шлях пазнання», быў проста пад моцным уражаннем ад таленту пісьменніка, ад жыцця яго герояў, ад каларытнай краіны...

Карацей, пакуль чытаў, — нібы сам пажыў там і даведаўся столькі... Крыжаванку скласці, мне здавалася, што раз плюнуць! Ну сапраўды: некалькі слоў можна ўзяць з рамана, некалькі — з іншых крыніц (пра інтэрнэт я тады толькі чуў)...

Больш за тыдзень рабіў картатэку: заносіў патрэбныя словы ў адпаведныя рубрыкі. Аднаго Фейхтвангера і сапраўды аказалася мала: пайшлі ў «распрацоўку» іншыя аўтары, іншыя творы. Уразіў, помню, Бальтасар Грасіян сваім «Кішэнным аракулам». Гэтую «Навуку разважлівасці» я праштудзіраваў уздоўж і ўпоперак — вельмі мудрая кніга! А ў выніку...

Луіза, Канчыта, Мігель, Хуан, маха, дуэння, капа, картэха, наваха, чамберга, Севілья, Андалусія, Кадзіс... З дзясяткамі, а то і сотнямі гэткіх слоў я засынаў і прачынаўся.

Напоўніўшы картатэку, стаў працаваць над пытаннямі і падборам адказаў, а напрыканцы — над самім дызайнам крыжаванкі. Агулам жа — праўду кажу — гэта была амаль навуковая праца, створаная апантаным аматарам, улюбёным у недасяжна далёкую тады Іспанію.

Чаму ў яе? Загадка нават для мяне, бо ніякая іншая краіна ні да таго, ні пасля вось так не цікавіла...

І вось нарэшце я купіў канверт, паклаў туды свой шэдэўр, напісаў адрас і заказным лістом адправіў у Маскву, на вуліцу Акадэміка Каралёва, 12. Спадару Леаніду Якубовічу, на «Поле цудаў».

Праз нейкі час мне прыйшло паведамленне, што ліст здадзены ў «экспедыцыю цэнтральнага тэлебачання».

...Што з ім далей было, я магу толькі здагадвацца. Хутчэй за ўсё першы ж чалавек з той экспедыцыі, зірнуўшы на мой твор, злажыў з яго прыгожы самалёцік і прамой наводкай «пасадзіў» у вялікай сметніцы... Альбо, ад душы пасмяяўшыся сам, для таго ж занёс Якубовічу. Бо насамрэч (як я потым даведаўся) іспанская крыжаванка ў адрозненне ад класічнай — гэта слоўная галаваломка, якая звычайна прымае форму квадратнай альбо прамавугольнай сеткі белых і зацененых плошчаў, і мэта яе заключаецца ў тым, каб запоўніць белыя квадраты літарамі, утвараючы словы ці фразы...

Карацей, гэта зусім не тое, над чым столькі часу пракарпеў я.

Думаеце, шкадую, што так «лахануўся», што марна стараўся, працаваў? Ды ніколечкі, бо на ўлюбёную Іспанію мне нічагуткі не шкада.

Сістэма сувязяў, якая склалася на рэгіянальным узроўні, з'яўляецца дзейсным механізмам рашэння шырокага спектру практычных задач у самых розных сферах. Прыярытэтным кірункам узаемадзеяння на міжрэгіянальным узроўні застаецца эканамічнае супрацоўніцтва.

З асобнымі рэгіёнамі Расіі, такімі як Масква і Санкт-Пецярбург, Цюменская, Смаленская, Маскоўская вобласці, Рэспубліка Татарстан, наш тавараабарот значна перавышае аб'ёмы гандлю Рэспублікі Беларусь з многімі краінамі свету. Рэгіёнамі назапашаны значны вопыт прамысловай кааперацыі, створаны трывалыя тэхналагічныя ланцужкі ў машынабудаванні, нафтахіміі, фармацэўтыцы, іншых галінах.

Больш за 8 тыс. беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў з'яўляюцца цеснымі партнёрамі, ажыццяўляючы ўзаемныя пастаўкі сыравіны, матэрыялаў і камплектуючых. У Беларусі каля 2,2 тыс. арганізацый з расійскім капіталам, у тым ліку больш за 1,3 тыс. сумесных прадпрыемстваў, што складае амаль 40 % ад агульнай колькасці арганізацый з замежным капіталам у Беларусі. На тэрыторыі 23 рэгіёнаў Расіі зарэгістравана больш за 40 сумесных зборачных вытворчасцяў беларускай тэхнікі. Створана каля 170 беларускіх суб'ектаў тавараправоднай сеткі. Напрыклад, толькі на тэрыторыі Смаленскай вобласці ажыццяўляюць сваю дзейнасць больш за 80 прадпрыемстваў з беларускім капіталам. Пашырэнне партнёрскіх сувязяў на ўзроўні рэгіёнаў дазволіць вырашыць такія важныя задачы, як імпартазамяшчэнне, стымуляванне экспартаарыентаваных вытворчасцяў, пераадоленне тэхналагічнага разрыву з Захадам.

Сур'ёзнай дапамогай выбудоўванні інфраструктуры двухбаковага супрацоўніцтва служыць салідная дагаворна-прававая база міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння. Яе складаюць каля 70 пагадненняў аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве на ўзроўні ўрада Рэспублікі Беларусь і адміністрацый рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі, а таксама каля 300 пагадненняў паміж рэгіёнамі Беларусі і суб'ектамі Расійскай Федэрацыі і муніцыпальнымі ўтварэннямі.

У 2017-м падпісаны пагадненні паміж урадам Беларусі і ўрадамі Чачэнскай і Чувашскай рэспублік, Рэспублікі Мардовія, Стаўрапольскага краю, Кастрамской, Пскоўскай і Разанскай абласцей аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і сацыяльна-культурным супрацоўніцтве, а таксама больш за 100 міжрэгіянальных дакументаў аб супрацоўніцтве з 48 суб'ектамі Расійскай Федэрацыі. Адны з задач, якія трэба будзе вырашыць на ўзроўні знешнепалітычных ведамстваў, — правядзенне інвентарызацыі наяўных двухбаковых дакументаў, кваліфікаваная дапрацоўка і гарманізацыя адпаведных баз даных.

Форумы рэгіёнаў Беларусі і Расіі сталі адмысловымі пляцоўкамі для абмену вопытам і перадавымі тэхналогіямі, добрымі прыкладамі сістэмнай работы па развіцці міжрэгіянальных кантактаў. Высокі статус форумаў пацвярджаецца традыцыйным удзелам у іх кіраўнікоў нашых дзяржаў.

Адзін з новых фарматаў развіцця міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, які паспяхова апрабаваны летась, — арганізацыя прэзентацый абласцей Беларусі, а таксама сталіцы на пляцоўцы дзелавога і культурнага цэнтра нашага пасольства ў Маскве. Наяўныя магчымасці дазваляюць правесці там мультымедыйную прэзентацыю рэгіёна з акцэнтам на інвестыцыйны і экспартны патэнцыял, арганізаваць канцэртную праграму, дэгустацыю страў нацыянальнай кухні, іншыя мерапрыемствы. Такія прэзентацыі арыентаваны на дыпламатычны корпус у Маскве, прадстаўнікоў расійскіх рэгіёнаў, дзелавыя колы.

Надзея АНІСОВІЧ.

СЯБРОЎСТВА, ІНІЦЫЯТЫВЫ

У пачатку жніўня вызначымся з праграмай гэтых наведванняў, каб яны былі па максімуме карысныя. Трэба нашым суседзям паказаць прадпрыемствы, турыстычныя аб'екты, правесці з удзелам прадстаўнікоў малога бізнесу кантактна-кааперацыйныя біржы. Інфармацыя будзе абагульняцца, каб мы дакладна ведалі, што рэальна зроблена на сённяшні дзень.

Моладзь рулюе

Шмат мерапрыемстваў з удзелам моладзі абедзвюх краін запланавана напярэдадні форуму. Сімвалічна, што Магілёў сёлета з'яўляецца маладзёжнай сталіцай і сумесныя сустрэчы з расійскімі равеснікамі адбываюцца рэгулярна на працягу года. Наперадзе VI Маладзёжны форум Беларусі і Расіі «Моладзь за Саюзную дзяржаву» і злёт студэнцкіх атрадаў. Пад эгідай БРСМ будзе арганізаваны тэлемост «Адкрыты дыялог». Падчас форуму рэгіёнаў будуць задзейнічаны два магілёўскія ўніверсітэты — харчавання і МДУ імя А. Куляшова. Адна з секцый пройдзе пад знакам супрацоўніцтва моладзі. У МДУ, напрыклад, паразважаюць аб сацыяльнай і грамадзянскай актыўнасці моладзі Беларусі і Расіі: «Традыцыі і навацыі».

Курс на лічбавую эканоміку

Без прагрэсіўных тэхналогій і навуковага падыходу сёння не абысціся. На пляцоўцы магілёўскага прадпрыемства «Магілёўліфтмаш» пройдзе работа секцыі «Лічбавая эканоміка: супрацоўніцтва рэгіёнаў, стан і перспектыва». Плануецца, што ў рабоце секцыі прыме ўдзел каля 60 чалавек.

Намеснік генеральнага дырэктара «Магілёўліфтмаша» Мікалай МІХАЛЕНЯ ўдакладняе, што да прыёму гасцей амаль усё гатова. Зроблена рэканструкцыя залы пасяджэнняў, устаноўлена новае абсталяванне.

Суразмоўнік звяртае ўвагу на агароджаную пляцоўку за акном, дзе будзе зманціравана шмат'ярусная аўтапаркоўка. Плануецца прадэманстраваць яе магчымасці ўдзельнікам форуму. Такія прыстасаванні асабліва будуць дарэчы там, дзе не хапае звычайных парковак для машын. Кліенту выдаецца чып, ён заганяе транспарт унутр, вароты зачыняюцца, і машына падымаецца на любы паверх. Распрацоўка ўнікальная, такога ў краіне яшчэ няма.

— У нас ёсць яшчэ шмат чаго новага і прагрэсіўнага, напрыклад ліфты без машыннага аддзялення, травалатары, так званыя пасажырскія канвееры, — кажа Мікалай Міхаленя. — Падчас работы секцыі плануецца падпісанне асобных кантрактаў як паміж краінамі, так і, магчыма, паміж намі і расійскімі прадстаўнікамі.

— Наша прадукцыя карыстаецца попытам, ёсць магчымасць укладаць грошы ў развіццё вытворчасці, кожны год мы асвойваем новыя перадавыя тэхналогіі, — **начальнік аддзела механізацыі і аўтаматызацыі Юрый ЧАРНАГРЭБЕЛЬ** таксама спадзяецца на ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва.

Дарэчы, у чэрвені на пляцоўцы «Магілёўліфтмаша» адбыўся круглы стол па тэме «Пераход да лічбавай эканомікі як умова канкурэнтаздольнасці Беларусі і Расіі» з удзелам прадстаўнікоў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь — віцэ-спікера Марыяны Шчоткінай і старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзіміра Панцюхова.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ПЛІТЫ, ЦУКАР І ТРЫКАТАЖ...

Вытворцы ведаюць, што прапанаваць

Да V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі актыўна рыхтуюцца на прадпрыемстве «Пінскае прамыслова-гандлёвае аб'яднанне «Палессе». Летась палескія трыкатажнікі ўдзельнічалі ў маскоўскім форуме, прадстаўлялі там сваю калекцыю колькасцю больш чым у тры сотні мадэляў мужчынскага, жаночага, дзіцячага адзення. І не без поспеху.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Дырэктар прадпрыемства Таццяна ЛУГІНА сказала карэспандэнту «МС», што восенню ў Магілёве яны маюць намер сустрэцца з патэнцыяльнымі партнёрамі зноў:

— Выязджаць на падобныя мерапрыемствы не пажадана, а абавязкова такім вытворцам, як мы, — кажа Таццяна Аляксееўна. — Бо 90 працэнтаў экспарту нашай прадукцыі прыходзіцца на расійскі рынак. Але ж аднойчы заваяваць пэўную рынкавую нішу не азначае завалодаць ёй назаўсёды. Пастаянна трэба быць у курсе рынкавых ваганняў. Неабходна ведаць эканамічную сітуацыю партнёраў, якая схільная мяняцца, а таксама важна сачыць за пакупніцкімі сімпатыямі і перавагамі. Таму важна часцей сустракацца з гандлёвымі партнёрамі, абмяркоўваць магчымае супрацоўніцтва і прапаноўваць прадукцыю. Зноў павязём узоры нашых вырабаў, абавязкова нешта з апошніх распрацовак, напрыклад, трыкатаж выраблены з выкарыстаннем ільняных і баваўняных тканін.

— Зараз актыўна вядзецца прапрацоўка праектаў пагадненняў з расійскім бокам, — паведаміў **начальнік упраўлення знешнеэканамічных сувязяў Брэсцкага аблвыканкама Сяргей ХІЗАЎ.** — Рыхтуюцца цэлыя пакеты дакументаў як рэгіянальнага характару, так і прапановы асобных кантрактаў для прадпрыемстваў. У Магілёўскім форуме будуць удзельнічаць афіцыйная дэлегацыя Брэстчыны і прадстаўнікі дзелавых колаў. Такое грунтоўнае стаўленне да названага мерапрыемства абумоўлена тым, што Расія для Брэстчыны з'яўляецца асноўным гандлёва-эканамічным партнёрам, на яе прыходзіцца 72 працэнты экспарту рэгіёна.

> “Пастаянна трэба быць у курсе рынкавых ваганняў. Неабходна ведаць эканамічную сітуацыю партнёраў, якая схільная мяняцца, а таксама важна сачыць за пакупніцкімі сімпатыямі і перавагамі. Таму важна часцей сустракацца з гандлёвымі партнёрамі, абмяркоўваць магчымае супрацоўніцтва і прапаноўваць прадукцыю.

Буйныя прадпрыемствы заходняга рэгіёна краіны даўно і плённа працуюць з Расіяй. Напрыклад, брэнды «Савушкін прадукт» і «Санта» даўно сталі пазнавальнымі для пакупніка з суседняй краіны. Паспяхова супрацоўнічаюць з усходнімі партнёрамі фактычна ўсе нашы мяса-малочныя перапрацоўшчыкі. Упэўнена сябе адчувае на расійскім рынку знакаміты вытворца пластыкавых цацак з Кобрына — «ПП Палессе» і нават мае там сваё прадстаўніцтва. Прадаюцца ў Расіі брэсцкія газавыя пліты і жабінкаўскі цукар, баранавіцкія баваўняныя тканіны і маларыцкія агароднінныя кансервы. Так што на форуме брастаўчанам будзе што паказаць.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

На што ідзе «дэпутацкі мільён»?

Пра Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, прамыя сувязі, турызм і дзейнасць народных абраннікаў у размове з намеснікам губернатара Кастрамской вобласці Юрыем Макавым

РАЗМОВА аб неабходнасці ўмацоўваць двухбаковыя адносіны паміж Беларуссю і рэгіёнамі Расіі ішла летась падчас сустрэчы губернатара Кастрамской вобласці Сяргея Сітнікава і Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Мінску. У рамках візіту было падпісана пагадненне паміж Беларуссю і Кастрамской вобласцю аб супрацоўніцтве ў гандлёва-эканамічным і сацыяльна-культурным кірунках. Аб тым, што гэта не проста словы на паперы, сведчыў і нядаўні візіт беларускіх журналістаў у Кастрамскую вобласць. У журналістаў была магчымасць задаць пытанні намесніку губернатара па эканамічных пытаннях Юрыю МАКАВУ. Карэспандэнт «Звязды» пацікавілася дзейнасцю кастрамскіх дэпутатаў і планамі па ўдзеле ў Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які будзе праходзіць сёлета ў Магілёве.

— Сёння эканамічнае супрацоўніцтва Кастрамской вобласці вядзецца ў асноўным з трыма рэгіёнамі Беларусі — Брэсцкім, Віцебскім і Магілёўскім. Мы імпартуем з Беларусі харчаванне і ўсё, што звязана з сельгаспрадукцыяй, машынамі, пад'ёмнымі механізмамі, тэкстылем і абуткам. Тавараабарот паміж Кастрамской вобласцю і Беларуссю складае каля 55 мільёнаў рублёў у год, і лічба штогод узрастае на 10—15 %. Але гэта не мяжа. І мы хочам, каб пра нас як мага больш ведалі ў Беларусі. Кастрамская вобласць аграрная, але ў нас не вельмі пладародныя глебы, і, каб дабіцца высокіх ураджаяў, трэба ўносіць шмат угнаенняў. Таму асноўны ўпор мы робім не на раслінавод-

> Кастрама з яе амаль 1000-гадовай гісторыяй уваходзіць у «Залатое кальцо Расіі» і прысутнічае ў топ-10 патэнцыйнага турыста. Тут ёсць што паглядзець. Менавіта адсюль зараджалася Русь.

ства, а на развіццё малочнай жывёлагадоўлі. Ставім мэту забяспечыць сябе малаком і стаць яго экспарцёрам. Але ў нас пакуль адчуваецца малочны дэфіцыт. Асабліва на фоне росту сырнай вытворчасці. У вобласці вельмі моцныя традыцыі сыраварства. У выніку мы завозім малако з суседніх рэгіёнаў і, безумоўна, аказваем падтрымку тым прадпрымальнікам, якія займаюцца жывёлагадоўляй. Адпаведныя праграмы ёсць на федэральным і абласным узроўнях.

— Сёлета ў Магілёве праводзіцца Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, дзе будзе добрая магчымасць прадстаўнікам дзвюх краін пазнаёміцца бліжэй і абгаварыць сумесныя праекты...

— Так. Мы плануем прыняць удзел у гэтым форуме. Ад нашага рэгіёна ў Магілёў паедзе дэлегацыя з некалькіх чалавек. Вельмі хацелася б наведаць гэта мерапрыемства і на месцы паглядзець, чым мы можам быць карысныя адно аднаму.

— Наколькі адчувальна на жыццё Кастрамской вобласці ўплываюць дэпутаты? Што яны ставяць на пярэдні план у сваёй рабоце?

— Што датычыцца абласной Думы, то ў нас 35 дэпутатаў, асноўная іх дзейнасць — заканатворчасць, прыняцце нарматыўных актаў на рэгіянальным узроўні і работа з насельніцтвам у тых акругах, дзе яны былі абраныя. Усе дэпутаты працуюць на нявызваленай аснове. За зарплату працуе толькі апарат Думы. Але для асноўнага складу дэпутатаў гэта — грамадская нагрузка.

Формы работы разнастайныя. Ёсць у нас, вобразна кажучы, дэпутацкі мільён. Сродкі, якія выдзяляюцца кожнаму дэпутату, ідуць на рэалізацыю нейкіх грамадскіх ініцыятыў — добраўпарадкаванне двароў, паркаў і гэтак далей. Які праект рэалізаваць, вырашаецца народным галасаваннем. Ёсць яшчэ федэральныя праграмы, звязаныя з фарміраваннем камфортнага гарадскога асяроддзя. Там таксама выдзяляюцца пэўныя сродкі на падтрымку грамадскіх ініцыятыў. Людзі прапануюць, што яны хацелі б зрабіць, галасуюць і рэа-

> Тавараабарот паміж Кастрамской вобласцю і Беларуссю складае каля 55 мільёнаў рублёў у год, і лічба штогод узрастае на 10—15 %. Але гэта не мяжа.

лізуюць той праект, які набраў большую колькасць галасоў. Улада зараз імкнецца ўцягнуць народ у актыўную дзейнасць. Калі ўсе разам выходзяць на суботнік, рэдка ў кагосьці ўзнікае жаданне нешта паламаць.

— Чым Кастрама цікавая турыстам і што асабліва вабіць сюды народ?

— Нас штогод наведвае каля мільёна турыстаў. Кастрама з яе амаль 1000-гадовай гісторыяй уваходзіць у «Залатое кальцо Расіі» і прысутнічае ў топ-10 патэнцыйнага турыста. Тут ёсць што паглядзець. Менавіта адсюль зараджалася Русь. Тут, у Кастрамской вобласці, ствараецца каля 50 % ювелірных вырабаў Расіі. У нас ёсць цудоўная ласяферма, дзе можна пакаштаваць ласінага малака і ўбачыць маралаў. За сорак кіламетраў ад Кастрамы знаходзіцца старадаўні горад-музей Нерахта з надзвычайнай архітэктурай. Але да нас едуць у асноўным расіяне, замежных турыстаў усяго 3-5 %. Калі мы пачалі разбірацца, чаму так мала, высветлілі, што ў нас не хапае гасцініц. Попыт на іх апераджае прапанову. Зараз у Савеце Федэрацыі фарміруецца праграма па развіцці ўязнога і ўнутранага турызму на 2020—2025 гады, рэгіёны робяць заяўкі і абараняюць свае праекты. Найлепшыя атрымліваюць федэральнае фінансаванне. Дзяржава зацікаўлена ў суфінансаванні з боку прыватнага бізнесу. Зараз мы аднаўляем у Кастраме крэмль за грошы мецэната, і пад гэтую тэму збіраемся ўвайсці ў федэральную праграму з праектам па добраўпарадкаванні набярэжнай і парка па суседстве з крамлём.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении 12 сентября 2018 г. аукциона по продаже изъятого по Указу Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 г. № 87 «О некоторых мерах по сокращению не завершенных строительством, незаконсервированных жилых домов, дач» не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома и в частную собственность земельный участок, на котором расположен предмет аукциона в Радваничском сельском Совете Брестского района

№ лота	Местоположение незавершенного строительством незаконсервированного жилого дома	Характеристика объекта оценки	Площадь земельного участка, га	Начальная цена предмета аукциона (в том числе начальная цен не завершенного строительством капитального строения), бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Возмещение расходов
1	Брестский район, д. Франополь, ул. Новая, д. 5А	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение (фундамент), наружной площадью 178 кв. м, готовность основного строения 3 %, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 121283702101000143	0,2250	6000,00 (1178,83)	600,00	1. Государственная регистрация прекращения права собственности на земельный участок – 73,50 руб.; 2. Объявления – согласно актам выполненных работ

Имеется возможность электрификации, газификации.

Аукцион будет проводиться 12 сентября 2018 г. в 11.00 по адресу: Брестский район, аг. Большие Радваничи, ул. Центральная, 94 (в здании сельисполкома).

Для участия в аукционе необходимо подать заявление и предоставить копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Радваничского сельисполкома (BY61-AKBB36410000002621000000, БИК AKBBB421100 ф-л № 100 ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 200036035, код платежа – 4901) суммы задатка в размере 10 % от начальной цены земельного участка, а также документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Для проведения аукциона необходимо наличие не менее 2 участников. Если аукцион признан несостоявшимся из-за того, что заявление на участие в нем подано только одним гражданином, земельный участок предоставляется этому гражданину при его согласии с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, осуществляется победителем аукциона либо единственным участником аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: Брестский район, аг. Большие Радваничи, ул. Центральная, 94 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявления – 6 сентября 2018 г. до 17.00. Дополнительную информацию о земельном участке можно получить по телефонам: 93 11 35, 93 11 36, 93 11 30, 93 16 11.

Извещение

о реализации недвижимого имущества ОАО «Барановичидрев», имеющих высокий износ 12-е повторные торги по Лотам № 8–10 000 рублей; № 9–21 000 рублей, цена снижена более чем на 50 %, без НДС. Торги состояться 17 августа 2018 г., в 14.00 по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3

Сумма задатка: 10 % от начальной цены Лотов в рублях РБ.

Получатель платежа: 225410, ОАО «Барановичидрев», г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3.

Р/с: BY68BPSB30121226161389330000; БИК BPSBBY2X в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск. УНН 200299909.

Назначение платежа – задаток за участие в аукционе.

Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению.

Заявление на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, по всем ЛОТАМ в срок до 14.00 14.08.2018 года, организатору торгов председателю ликвидационной комиссии Мищуку А. М. по адресу:

225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, ОАО «Барановичидрев».

Конт. тел.: 8 029 6332490 vel; (029) 8248026 МТС; факс (0163) 455124; Emal: mischuk_am@mail.ru

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Дополнительным условием ко всем Лотам для победителей торгов является обязательное предварительное заключение отдельного договора купли-продажи имеющегося на приобретаемой территории асфальтного покрытия, ограждения (забора), ворота, зеленых насаждений, коммуникаций и прочего имущества по данным бухгалтерского учета.

Обременением к ЛОТУ № 9 для победителя торгов является обязательное условие сохранения прав ликвидационной комиссии (ликвидатора) и антикризисного Управляющего (в банкротстве) в части безвозмездного использования помещения проходной и станции перекачки конденсата являющейся составной частью Лота № 9 до завершения процедуры банкротства и выведения должника из ЕГР РБ.

Торги осуществляются в соответствии с постановлением СМ РБ № 16 от 08.01.2013

Более подробно с условиями и объектами аукциона можно ознакомиться на сайтах Госкомимущества и Министерства строительства и архитектуры с 06.08.2018 года.

АСАБЛІВАСЦІ НАРАДЖЭННЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1–й стар. «МС».)

Гэта датычыцца і выпадкаў, калі жанчыне неабходна выдаліць яечнікі, пасля чаго немагчыма будзе атрымаць уласную яйцаклетку. Таму прапануецца даць права на захоўванне палавых клетак асобам, якія не маюць дыягназу «бясплоднасць».

Змяненні закранаюць сурагатнае мацярынства. Прапануецца павялічыць узрост сурагатнай маці да 49 гадоў уключна, калі яна з'яўляецца сваячкай пацыенткі. Дзейны закон дазваляе жанчыне быць сурагатнай маці ва ўзросце ад 20 да 35 гадоў. Праект закона дазваляе сурагатнай маці таксама не быць у шлюбе, калі яна мае паўналетняе дзіця і не мае непаўналетняга. Зараз дзейнічае патрабаванне наяўнасці ў такой жанчыны мужа (для забеспячэння абароны правоў яе непаўналетняга дзіцяці ў выніку ўзнікнення праблем са здароўем падчас цяжарнасці і родаў).

Донар для незамужняй

Па ўсіх вышэйпералічаных карэкціроўках удзельнікі рабочай групы, якая працавала над законапраектам, дасягнулі кансэнсусу. Спрэчку выклікала ўдакладненне, якое датычыцца выкарыстання донарскай спермы для пераадолення бясплоднасці незамужняй жанчыны. Дзейны закон вылучае ананімных і неананімных донараў. Неананімным можа быць толькі сваяк (у адносінах да жанчыны — яе сваяк жаночага полу, у адносінах да мужчыны — яго сваяк мужчынскага полу). Аднак адзін з артыкулаў выявіў дваякае тлумачэнне, якое незамужнія жанчыны разумелі як магчымасць выкарыстоўваць палавыя клеткі сваіх сужыцеляў. У сувязі з гэтым праект закона канкрэтызуе абмежаванні: незамужнія жанчыны могуць выкарыстоўваць сперму толькі ананімных донараў.

З гэтым удакладненнем не згодныя прадстаўнікі Цэнтра дапаможнай рэпрадукцыі «Эмбрыа», якія таксама ўваходзяць у рабочую групу па распрацоўцы законапраекта. «Наяўнасць або адсутнасць шлюбу не павінна быць перашкодай для аказання медыцынскай дапамогі, — упэўнены **дырэктар цэнтра Алег ЦІШКЕВІЧ.** — На пастаноўку дыягназу «бясплоднасць» гэта не ўплывае. Калі пастаўлены дыягназ, прызначаецца лячэнне. Іншыя метады лячэння бясплоднасці не патрабуюць афіцыйнага шлюбу. Дык чаму лячэнне з дапамогай рэпрадуктыўных тэхналогій павінна патрабаваць рэгістрацыі адносін у загсе? Тое, што дактары вымушаны будуць адмовіць у медыцынскай дапамозе, калі шлюб не афармлены, у выпадку дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій і не будуць адмаўляць, калі лячэнне праводзіцца іншымі метадамі, выклікае пэўныя прававыя і этычныя супярэчнасці».

Рэпрадуктолаг звяртае ўвагу на тое, што правы дзіцяці ў выпадку з дапаможнымі рэпрадуктыўнымі тэхналогіямі абароненыя больш, чым пры лячэнні бясплоднасці звычайнымі метадамі. У першым выпадку пацыенты падпісваюць інфармацыйную згоду, дзе ў тым ліку бяруць на сябе бацькоўскія правы і абавязкі. Калі жанчына не замужам і, згодна з праектам закона, пры ЭКА павінна выкарыстоўваць толькі сперму ананімнага донара, тады інфармаваную згоду падпісвае толькі ад свайго імя, і дзіця ў гэтым выпадку пазбаўляецца бацькі (па меншай меры, дакументальна).

— Аргументацыя, што адзінокая маці (якая не знаходзіцца ў шлюбе) атрымлівае дадатковую дапамогу на дзіця і «нагружае» тым самым бюджэт краіны — не вытрымлівае крытыкі, — дадае доктар. — Прыняцце папраўкі ў закон не прымусіць пары зарэгістраваць шлюб. Папраўка прымусіць іх паехаць рабіць ЭКА ў Расію або Украіну, дзе няма забаронных мер, яны вернуцца цяжарнымі і будуць атрымліваць тую ж дапамогу на дзіця. Абое рабое. А вось грошы з краіны яны вывезуць, і дзяржава недаатрымае ў бюджэт ні прамых паступленняў, ні падаткаў ад выканання платнай медыцынскай паслугі.

Кіраўнік медыцынскага цэнтра дадае, што праблемы ўзнікнуць і ў сувязі з развіццём медыцынскага турызму. Па-першае, не ва ўсіх краінах шлюб рэгіструецца ў загсе. І далёка не заўсёды можна даведацца, ці знаходзяцца замежныя грамадзяне ў афіцыйным шлюбе. Па-другое, ёсць краіны, якія рэгіструюць шлюб для аднаполых пар. Можа атрымацца так, што беларускай гетэрасексуальнай пары, якая не зарэгістравала шлюб, айчынныя клінікі адмовяць у прымяненні дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій і не адмовяць гомасексуальнай пары з іншай краіны, якая афармліла адносіны.

Супрацоўнікі «Эмбрыа» прапануюць дазволіць выкарыстоўваць палавыя клеткі мужчыны і жанчыны, якія сумесна звярнуліся па выкарыстанне дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Праблема ў кантролі

Гэта пазіцыя не ўвайшла ў дакумент, які паступіў у Палату прадстаўнікоў. Пункт гледжання апанентаў Цішкевіча «Звяздзе» растлумачыла Святлана Жукоўская.

— Закон «Аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях», у працоўную групу па стварэнні якога ў 2010—2012 гадах былі запрошаны спецыялісты нашага цэнтра, быў сапраўды неабходны нашаму грамадству, бо адносіны, якія ён рэгулюе, могуць выклікаць сур'ёзныя наступствы, як для канкрэтна ўзятай сям'і, так і для грамадства ў цэлым. Пасля прыняцця закона многія спрэчныя пытанні выкарыстання дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій былі ўрэгуляваныя, што дазволіла палегчыць работу ўрачам і забяспечыць гарантыі для пацыентаў і іх дзяцей,— падкрэсліла яна. — Дазвол жанчыне скарыстацца паслугамі неананімнага донара (напрыклад, сужыцеля) можа выклікаць не толькі сацыяльнае ўтрыманства. Галоўная небяспека ў складанасці кантролю такога донарства. Ананімны донар не мае права на атрыманне інфармацыі пра далейшае выкарыстанне яго палавых клетак, на высвятленне асоб дзіцяці, якое было зачатае з іх дапамогай, і яго бацькоў. Гэта адзін з прынцыпаў сусветнай практыкі. З мэтай арганізацыі работы па падборы ўзораў донарскіх палавых клетак і захавання ўрачэбнай тайны праводзіцца кадзіроўка і маркіроўка крыякансерваваных донарскіх палавых клетак.

З-за складанасці ўліку неананімнага донарства немагчыма кантраляваць і яго наступствы, напрыклад, імавернасць у будучым шлюбу паміж дзецьмі, якія нарадзіліся ад аднаго такога донара, дадае Святлана Жукоўская. Неананімны донар зможа шмат разоў у месяц аказваць паслугу, што будзе садзейнічаць назапашванню генетычных мутацый і ў будучыні можа нанесці шкоду здароўю нацыі. Да таго ж палавые клеткі, атрыманыя ад ананімнага донара, могуць выкарыстоўвацца толькі пасля іх крыякансервацыі і праходжання паўгадавога каранціну, што дазваляе папярэдзіць распаўсюджванне хвароб.

У выпадку са сваякамі захоўваецца таямніца нараджэння, ёсць дакладная інфармацыя пра стан здароўя донара, маюцца абмежаванні ў выкарыстанні біялагічнага матэрыялу. Да таго ж колькасць такіх праграм з-за патрабаванняў закона нязначная.

«Дапаможныя рэпрадуктыўныя тэхналогіі не лечаць, з іх дапамогай мы пераадольваем бясплоднасць, — удакладняе Святлана Жукоўская. — Таму, калі ў гэтым выпадку кажуць пра адмову ў медыцынскай дапамозе, то падмяняюць паняцці. Больш за тое, закон не пазбаўляе адзінокую жанчыну магчымасці рэалізаваць свае рэпрадуктыўныя правы. Закон гэта рэгламентуе, зыходзячы з меркаванняў аховы правоў дзіцяці і выключэння інфіцыравання жанчыны і плода такімі інфекцыямі, як ВІЧ, гепатыт С і В, сіфіліс».

Дырэктар Цэнтра рэпрадуктыўнай медыцыны нагадвае пра рашэнне Канстытуцыйнага Суда ад 28 снежня 2011 года, у якім адзначана, што абмежаванні, якія ўстанаўлівае закон, «апраўданыя, з'яўляюцца суразмернымі і неабходнымі для абароны такой канстытуцыйнай каштоўнасці, як здароўе чалавека, а таксама мацярынства і бацькоўства».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ПА ЛІСЦЕ ЧЫТАЧА

На самавольнай сцежцы ліхтары не прадугледжаны

«Я — дачніца з немалым стажам. Дача — у вёсцы Падыгрушша Смалявіцкага раёна. Месца прыгожае, утульнае, добрае транспартнае забеспячэнне: электрычкі, маршруткі. Але ёсць праблемы для жыхароў», — напісала ў «Мясцовае самакіраванне» жыхарка Мінска Ніна Горгуль.

Па словах нашай чытачкі, ад чыгуначнага прыпынку да сваіх участкаў даводзіцца ісці цераз поле, праз якое вядзе дарога. Вясной і летам, да сярэдзіны жніўня, можна дабрацца да вёскі без праблем — на вуліцы светла. А вось восенню і зімой узнікаюць складанасці, паколькі рана змяркаецца. «Але на ўсім участку пешаходнай сцежкі няма ніводнага ліхтара, — наракае жанчына. — А пры гэтым яшчэ трэба ўмудрыцца ў цемені перайсці кладку цераз канаву. А ідуць сюдой дахаты не толькі жыхары Падыгрушша, але і наступнай вёскі Скураты, дачнікі. Няўжо не знойдуцца сродкі ў адпаведных структурах, каб уладкаваць на гэтай дарозе хоць бы тры электрычныя слупы?»

Як растлумачыла **старшыня Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў Марына КЛЮЕВА,** да вёскі Падыгрушша вядзе ўладкаваная дарога. Але дачнікі, жыхары населеных пунктаў пратапталі самавольна сцежку. Яе тут наогул не павінна быць, паколькі гэта землі сельскагаспадарчага прызначэння, якія належаць адкрытаму акцыянернаму таварыству «Смалявічы-Бройлер». Натуральна, тут не прадугледжана і асвятленне.

— Я, канешне, па-чалавечы магу зразумець людзей, якія імкнуцца скараціць шлях, каб хутчэй дабрацца дамоў. Гэта нармальнае жаданне. Але не заўсёды так бывае, як нам хочацца. Ёсць агульнапрынятыя правілы і законы, якія нельга парушаць, — адзначыла суразмоўніца.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Толочинский райагросервис» (УНП 300011541)

Наименование (описание) имущества и его стоимость	Лот № 1. Станок фрезерный специальный КФПЭ-250, инв. № 609, 2002 года выпуска, начальная цена 3 304,80 рублей. Лот № 2. Станок электроэрозионный 4732ФЭМ, инв. № 608, 1986 года выпуска, начальная цена 1 695,20 рублей. Лот № 3. Компрессор 2ВМ4-24/3С, инв. № 606, 1984 года выпуска, начальная цена 642,40 рублей. Лот № 4. Станок правильный 330-44, инв. № 605, 1996 года выпуска, начальная цена 642,40 рублей. Лот № 5. Станок внутришлифовальный 3А228, инв. № 604, 1976 года выпуска, начальная цена 3 559,20 рублей. Лот № 6. Пресс КД -2326, инв. № 602, 1988 года выпуска, начальная цена 2 457,60 рублей. Лот № 7. Пресс закалочный СТ-140, инв. № 599, 2001 года выпуска, начальная цена 9 432,00 рублей. Лот № 8. Печь плавильно-раздаточная СВО-70, инв. № 603, 2006 года выпуска, начальная цена 2 669,60 рублей
Наличие обременений	Отсутствуют
Местонахождение имущества	г. Толочин, ул. Тракторная, 32
Место, дата и время проведения торгов	21.08.2018 г. в 12.00, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3
Справочная информация об организаторе торгов	Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, www.vitebskjust.gov.by). Судебный исполнитель – Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс: (80212) 610424, (8033) 6879148
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: – подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством; – внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудитель ного исполнения ГУЮ Витобл -исполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 20.08.2018 г. Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота). В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем)

СІМВАЛ З КРЫЛАМІ

Вясковая ластаўка стала сімвалам Рэчыцкага раёна. Такое рашэнне зацвердзілі на сесіі раённага Савета дэпутатаў, піша газета «Дняпровец».

dneprovec.by

Выбары праходзілі ў некалькі этапаў. Па выніках першага было прапанавана 14 птушак. У лідары выбіліся вясковая ластаўка, жаваранак палявы і вялікая сініца. Фінал галасавання праводзілі праз інтэрнэт на сайце газеты і ў суполцы «УКантакце». За птушыны сімвал прагаласавала больш за тры тысячы чалавек. Пераможца — вясковая ластаўка — мае амаль чорны верх цела з гранатавым бляскам, ніз белаваты. Характэрная пляма ржавага колеру на горле і меншая на лбе. У дарослых вельмі доўгі і з вялікай развілкай хвост, у маладых крайнія рулявыя не такія доўгія, а горла светла-карычневае.

З-ЗА ЖОРСТКАГА АБЫХОДЖАННЯ

У Лагойскім раёне ў адносінах да жыхара вёскі Міхалова, які забіў сабаку, заведзена крымінальная справа. Піша карэспандэнт газеты «Родны край».

Мужчына ўдарыў сабаку не менш за адзін раз палкай і яшчэ не менш за два разы сякерай. У выніку жывёла загінула. Злачынства кваліфікуецца як жорсткае абыходжанне з жывёлай, якое выклікала яе гібель ці калецтва, здзейсненае з хуліганскіх, карысных ці іншых нізкіх намераў ці ў прысутнасці заведама малалетняга. Падсуднаму свецяць грамадскія работы, або штраф, або папраўчыя работы на тэрмін да аднаго года, або арышт.

ВЁСКА З 200-ГАДОВАЙ ГІСТОРЫЯЙ

Упершыню Луты сталі вядомы ў 1780 годзе. Тады ў вёсцы налічвалася 8 двароў і 78 жыхароў. На гэтым тыдні там прайшло свята, дзе пабываў і карэспандэнт «Кричевской жизни».

Са святам вяскоўцаў павіншавала **старшыня раённага Савета дэпутатаў Ірына ПРУДНІКАВА.** Яна адзначыла, што ў раёне стала добрай традыцыяй праводзіць такія святы. Летась яны прайшлі ў кожным сельскім савеце. Сёлета такая акцыя стартуе з вёскі Луты. Свята было арганізавана па ініцыятыве старшыні Маляціцкага сельсавета пры актыўным удзеле Лутаўскай бібліятэкі-клуба і Маляціцкага сельскага клуба.

Старшыня Маляціцкага сельскага Савета дэпутатаў Алена Іванова ўручыла падзякі самаму маладому і самаму старому жыхарам вёскі. Таксама былі названы грамадзяне, чые двары ўпрыгожваюць вуліцу. Падзякі атрымалі жыхары і за іншыя заслугі. Акрамя таго, тым, хто мае патрэбу, было дастаўлена 130 адзінак адзення і абутку.

Надзея АНІСОВІЧ.

ВЕДАЙ СВАЁ

СЕЛЬСКАЯ ДЫСКАТЭКА Ў ІНТЭРНЭЦЕ

Як Гродзі сталі папулярным месцам адпачынку Ашмянскага раёна

МНОСТВА аўто ўздоўж дарогі, песенны «вінегрэт» да дзвюх гадзін ночы, святламузыка, бясплатныя кампазіцыі па заказе і каля 200 чалавек на танцавальнай пляцоўцы. Так па начах у пятніцу, суботу і нядзелю выглядае дыскатэка ў звычайным сельскім клубе вёскі Гродзі, хоць дабрацца сюды ў гэты час можна толькі на таксі ці сваім аўто, а да Ашмян — 12 кіламетраў. Тым не менш ужо некалькі гадоў сюды сцякаецца моладзь не толькі з мястэчак раёна, а і з суседняга Астравецкага.

Растлумачыць такую папулярнасць цяжка нават супрацоўнікам клуба. Тым больш што два гады таму яго ўвогуле закрывалі з-за адсутнасці туалетаў і камер відэаназірання. Цяпер на дыскатэцы ёсць усе неабходныя атрыбуты і няма адбою ад наведвальнікаў.

Амаль усіх заўсёднікаў тут даўно ведаюць, таму новыя твары адразу заўважаюцца і гасцям заўжды рады.

— Я стараюся ўсё арганізаваць з душой, спрабую зразумець моладзь, улавіць яе музычныя патрабаванні, стаўлю сябе на іх месца. Некаторыя нават кажуць, што я сама застыла ў маладосці, — смяецца **загадчыца аддзела культуры і вольнага часу вёскі Гродзі Станіслава ТАМАШЭВІЧ.**

Больш за тое, на дыскатэцы загадзя складаюць плэйліст, арыентуючыся на густ танцораў. Круцяць і рэтра, і сучасную папсу, і кампазіцыі 90-х... усё, што ведаюць усе, як кажуць тут.

Зваротная сувязь з гасцямі арганізавана праз інтэрнэт. У сацыяльнай сеткі «УКантакце» створана спецыяльная група «Дыскатэка Гродзі». Менавіта тут нараджаецца рэпертуар вечарын і пішуцца пажаданні і падзякі за сумесны адпачынак. Адміністратар групы праводзіць апытанкі, у які з дзён пэўных выхадных лепш праводзіць дыскатэку, арганізоўвае своеасаблівую пераклічку на старонцы, хто прыйдзе на вечарыну. Нават наладжвае розыгрышы бясплатнага ўваходу за перапост паведамленняў дыскатэкі.

Група, дарэчы, паралельна адыгрывае ролю клуба знаёмстваў, куды наведвальнікі пішуць, каб адшукаць адно аднаго і дамовіцца пра сустрэчу. А яшчэ — бюро знаходак, дзе паведамляюць пра знойдзеныя тэлефоны, пашпарты і іншыя рэчы, якія згубілі.

Магчыма, у гэтым і хаваецца сакрэт папулярнасці сельскай дыскатэкі ў Гродзях..., дзе ўсё душэўнае, роднае — і побач.

Ірына СІДАРОК.

ДЗЕ «ЯГАДНАЯ» ВЁСКА

Чарнічны фэст прайшоў у Воранаўскім раёне

Самыя лепшыя зборшчыкі чарніц атрымалі падарункі, а ўсе прысутныя — па кавалку духмянага пірага.

У Воранаўскім раёне ўжо нарыхтавалі чатыры тоны лясных ягад. Летась атрымалася закупіць у насельніцтва толькі 700 кілаграмаў. І нарыхтоўка працягваецца. Самай «ягаднай» лічыцца тэрыторыя каля вескі Больцішкі. Тут жывуць і самыя лепшыя зборшыкі ягад — Алена Цевель, Ганна Юрэвіч, Ірына Бароўская. У «ягаднай» вёсцы летась вырашылі распачаць чарнічны фэст. Сёлета свята прайшло другі раз.

Арганізатары падрыхтавалі для мясцовых жыхароў і турыстаў цікавую праграму. Нямала знайшлося ахвотных з'есці шклянку чарніц на хуткасць, весела прайшоў конкурс-дэфіле з чарніцамі. Была абрана і свая каралева «Чарнічнага фэсту» Ягадная пані — вясёлая і каларытная Людміла Лебядзевіч з Нацкага культурна-краязнаўчага цэнтра. Галоўным сюрпрызам свята стаў чарнічны дэсерт — вялізны пірог, якога хапіла ўсім прысутным.

Фота Вольгі ВАРАБ'ЁВАЙ.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

У ШЭМЕТАВА — ДА ШАСТАКОВІЧАЎ

ТРЭЦІ Міжнародны фестываль «У Шэметава ў Шастаковічаў» адбудзецца з 3 па 9 жніўня ў Мядзельскім раёне. Вядома, што па бацькоўскай лініі Дзмітрый Шастаковіч мае беларускія карані. Яго прадзед Пётр Міхайлавіч (1808—1871) нарадзіўся ў беларускім мястэчку Шэметава Завілейскага павета Віленскай губерні.

У фестывалі прымуць удзел музыканты з Беларусі, Францыі, Сербіі, Балгарыі.

Мэта фестывалю — захаванне памяці аб вядомым ва ўсім свеце кампазітары і папулярызацыя яго творчай спадчыны. У межах мерапрыемства пройдуць канцэртныя праграмы «Шастаковіч і італьянская музыка XVIII стагоддзя» ў касцёлах Святога Андрэя Апостала, Маці Божай Нястомнай Дапамогі ў маёнтку Шэметава, курортным пасёлку Нарач, санаторыі «Спадарожнік». Тут прагучаць творы Дзмітрыя Шастаковіча, а таксама італьянскіх кампазітараў Антоніа Вівальдзі, Джавані Батыста Пергалезі.

Фестываль праводзіцца з 2016 года па ініцыятыве прадстаўніка беларускай дыяспары ў Францыі, старшыні асацыяцыі «Францыя—Беларусь. Сяброўства» Аркадзя Валадося пры падтрымцы пасольства Рэспублікі Беларусь у Французскай Рэспубліцы, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Мінаблвыканкама і Мядзельскага райвыканкама.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Мясцовае самакіраванне

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 2 жніўня 2018 года.